**ЖАНЧЫНА–ЛЕГЕНДА**

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Мішчанка, дырэктар Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў, рашэннем журы рэспубліканскага конкурсу, арганізаванага Беларускім саюзам жанчын, удастоена звання "Жанчына года – 2011" у намінацыі "Жанчына-легенда". Чалавек невычэрпнай энергіі, яна ўнесла значны ўклад у развіццё педагагічнага руху і дэмакратызацыю сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Многія вучацца ў Людмілы Аляксееўны майстэрству зносін, кіравання і прафесійнага развіцця. Галоўная мэта яе працы – навучанне і выхаванне мастацка адораных дзяцей і моладзі, якія становяцца культурнай элітай краіны. Многія з выпускнікоў гімназіі-каледжа працуюць у вядучых творчых калектывах Беларусі і за яе межамі: у Прэзідэнцкім аркестры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным канцэртным аркестры, аркестры Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Марыінскім тэатры ў Санкт-Пецярбургу і іншых. Такую магчымасць яны атрымалі дзякуючы якаснай працы педагагічнага калектыву гімназіі, дзе вучыліся музыканты.

Комплексна-мэтавая праграма "Мастацка адораныя дзеці", якую ўзначаліла Людміла Аляксееўна, стала высновай інавацыйнай дзейнасці выкладчыкаў гімназіі-каледжа. Гэта праграма была адзначана дыпломам вышэйшай катэгорыі на Рэспубліканскім аглядзе-конкурсе метадычных і творчых работ выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных установ Беларусі. За апошнія пяць гадоў адзнакі Спецыяльнага фонду ПрэзідэнтаРэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі атрымалі 70 вучняў, з якіх 6 з'яўляюцца лаўрэатамі, 11 – дыпламантамі, 53 – стыпендыятамі гэтага фонду. У гімназіі-каледжы працуе 12 творчых калектываў, з якіх 5 удастоены звання "Узорны". Стаўшы ініцыятарам стварэння навучальнай установы новага тыпу, Людміла Аляксееўна здолела аб'яднаць вакол сябе таленавіты творчы калектыў педагогаў, якія працуюць самааддана, з вялікай любоўю да дзяцей, якія становяцца прафесіяналамі і на высокім узроўні прапагандуюць сусветную і нацыянальную музычную культуру.

***Жанчына—легенда : [аб Людміле Мішчанка, Заслужаным дзеячы культуры Рэспублікі Беларусь, дырэктары гімназіі-каледжа мастацтваў г. Магілёва] // Алеся. — 2012. — № 3. — С. 19.***